Цяперашняя задача ў распаўсюджванні традыцыйнай народнай культуры ў аграгарадках (традыцыйна — мястэчках) патрабуе падрыхтаваных спецыялістаў, якія, працуючы на месцах, будуць і надалей назапашваць і захоўваць творы традыцыйнага музычнага мастацтва.

Такім чынам, задачы па захаванню, ахове і далейшай трансляцыі традыцыйнай музычнай культуры на сучасным этапе развіцця нашага грамадства паўстаюць дастаткова складаныя, але трэба, не губляючы часу, абгрунтоўваць і вырашаць іх сумеснымі дзеяннямі.

*Спіс выкарастаных крыніц*

1. *Гусев, В. Е.* Эстетика фольклора / В. Е. Гусев. — Л., 1967.
2. Народная культура в современных условиях : учеб. пособие / М-во культуры РФ ; Рос. ин-т культурологи ; отв. ред. Н. Г. Михайлова. — М., 2000.



Яўген Сахута

доктар мастацтвазнаўства, прафесар,
вядучы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

# Сучаснае народнае мастацтва: праблемы бытавання і развіцця

Апошнія два дзесяцігоддзі вызначаюцца ростам цікавасці да набыткаў традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі, актыўнай дзейнасці па яе адраджэнню, зберажэнню, развіццю, уключэнню ў сучасныя культурныя працэсы. Адраджаюцца многія яшчэ нядаўна амаль забытыя звычаі, абрады, традыцыі, узнаўляюцца з небыцця традыцыйныя рамёствы і промыслы, якія яшчэ нядаўна ў шырокай свядомасці звязваліся з учарашняй вёскай, лічыліся атрыбутамі мінулага, у лепшым выпадку — музейнай экзотыкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

або асноваю для сучаснай сувенірнай індустрыі. На шчасце, мы паразумнелі раней, чым маглі б канчаткова страціць апошнія праявы і набыткі народнай мастацкай творчасці, як гэта здарылася ў многіх краінах Еўропы яшчэ ў канцы XIX ст. пад наступам навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Зразумела, не абышла гэтыя працэсы і Беларусь — хоць і з прыметным спазненнем. Да канца 1980-х гг. перасталі працаваць практычна ўсе ганчарскія асяродкі, занепалі кавальства, пляценне з лазы, даўно забылі выцінанку і роспіс, а за кросны садзіліся толькі адзінкавыя ткачыхі. Жыло і нават развівалася хіба толькі саломапляценне, якому адводзілася роля адметнага нацыянальнага сувенірнага брэнда. Але паколькі народныя мастацкія рамёствы і промыслы было нельга цалкам выключыць з кантэксту савецкай культуры, іх месца павінны былі заняць прадпрыемствы мастацкіх промыслаў, арганізаваных на дзяржаўнай аснове, і мастацкая самадзейнасць шырокіх народных мас.

Паваротным момантам у адносінах да традыцыйных рамёстваў і промыслаў сталі працэсы перабудовы, якія стымулявалі ўздым самасвядомасці ў постсавецкіх народаў, у тым ліку і ў беларусаў. Набыццё незалежнасці актывізавала гэтыя працэсы. У нас нібыта адкрыліся вочы на багатыя здабыткі беларускай культуры, якая найбольш ярка вызначае адметнасць нашага народа ў еўрапейскай супольнасці. Традыцыйнае народнае мастацтва, мастацкія рамёствы і промыслы перасталі асацыіравацца з адсталасцю, учарашнім днём. Наадварот, далучэнне да гэтага пласта нацыянальнай культуры стала, з аднаго боку, прадметам гонару, з другога — аб'ектам, які патрабуе ўвагі, клопату, намаганняў па зберажэнню, адраджэнню і развіццю.



Вынікі гэтых працэсаў відавочныя. У краіне вядзецца шырокая работа па пошуку народных майстроў старэйшага пакалення, гуртаванню іх у розныя аб'яднанні, уключэнні ў працэс перадачы традыцый, да якіх актыўна і без якіх-небудзь комплексаў далучаецца моладзь. Найбольш эфектыўная і цалкам сучасная форма такой перадачы і пераемнасці традыцый — дамы і цэнтры рамёстваў, якіх на сённяшні дзень ужо больш за сотню (на Віцебшчыне яны дзейнічаюць у кожным раёне). Рэгулярнымі і звыклымі сталі розныя фестывалі, святы, конкурсы, выстаўкі — як з шырокім тэматычным дыяпазонам, так і па асобных відах традыцыйных рамёстваў і промыслаў. Створана і паспяхова дзейнічае рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне дзеячаў гэтай галіны нацыянальнай культуры — Беларускі саюз майстроў народнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак агляд дасягненняў у галіне сучаснага народнага мастацтва, мастацкіх рамёстваў і промыслаў, аналіз і характарыстыка іх становішча, характару, асаблівасцей — тэма асобнай размовы. На жаль, на гэтай ніве не ўсё так добра, як хацелася б, працэс ускладняецца ці нават тармазіцца шматлікімі праблемамі, негатыўнымі праявамі аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару. Таму ёсць неабходнасць удзяліць асноўную ўвагу менавіта гэтаму пытанню, каб, з аднаго боку, аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю, з другога — па меры магчымасці ўплываць на яе.

У дадатак да такіх ужо добра вядомых працэсаў аб'ектыўнага характару, як глабалізацыя, інтэрнацыяналізацыя, наступленне навукова-тэхнічнага прагрэсу з іх негатыўным уздзеяннем на традыцыйную народную творчасць, трэба згадаць катастрафічнае старэнне і заняпад вёскі — спрадвечнай захавальніцы традыцый народнай мастацкай творчасці. Абрываецца сувязь пакаленняў, імклівымі тэмпамі ідуць працэсы разбурэння традыцыйнага сямейнага ўкладу, звужаюцца ўмовы для мастацкай творчасці і занятку традыцыйнымі рамёствамі. Такія новыя формы арганізацыі перадачы і пераемнасці традыцый, як дамы і цэнтры рамёстваў, у вёсках пакуль што рэдкія і наўрад ці там іх стане больш. Узвядзенне аграгарадкоў праблему не вырашае. Безаблічнае, узведзенае па тыпавых праектах, стандартнае жыллё зусім не стымулюе да занятку традыцыйнымі відамі мастацкай творчасці, ды і засяляецца яно нярэдка выпадковым прыезджым кантынгентам. Разам са змяненнем ці разбурэннем этнакультурнага асяроддзя традыцыйная мастацкая культура выцясняецца антымастацтвам, безгустоўнасцю, living рознымі формамі масавай культуры, якая нярэдка выдаецца за сучаснае народнае мастацтва, чым затушоўваецца сапраўдная карціна яго сённяшняга становішча, згладжваюцца праблемы, няма яснасці на бліжэйшую перспектыву.

Тыя віды і формы народнай мастацкай творчасці, якія ствараюць аптымістычную карціну яе сённяшняга адраджэння і развіцця, у большасці сваёй тыпова гарадскія. Зразумела, што імкнуцца тут да поўнай аўтэнтыкі нерэальна (як, зрэшты, і ў вёсцы), сучасныя патрэбы грамадства дыктуюць адпаведныя рэаліі. У большасці выпадкаў творчасць гарадскіх майстроў, асабліва малодшага пакалення, дэманструе другасны ўзровень народнага мастацтва, творчасць «па матывах» яго. Аднак вялікай бяды тут няма, народнае мастацтва — з'ява жывая, якая заўсёды адгукалася на новыя рэаліі ў развіцці грамадства. Гэта адрознівае яго ад вуснапаэтычных відаў народнай творчасці, у адносінах да якіх існуюць паняцці «фалькларызм», «фалькларызацыя» — штучная «апрацоўка»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйных форм фальклору дзеля іх «асучаснівання». Што да народнага мастацтва, то яно «асучасніваецца» само ў адпаведнасці з часам і грамадскімі запатрабаваннямі, і яго сённяшні прыметна зменены характар у многіх выпадках зусім не азначае карэннага адрыву ад традыцый.

Куды большую занепакоенасць выклікае прыметная камерцыялізацыя народнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў. На хвалі сённяшняй цікавасці да яго актывізуюцца розныя вытворцы-непрафесіяналы і аматары, якія не з’яўляюцца носьбітамі або пераемнікамі традыцый. Павярхоўна, механічна засвоіўшы некаторыя найбольш простыя прыёмы і тэхналогіі таго ці іншага рамяства, яны выдаюць сваю прадукцыю за народнае мастацтва. Цікавасць да яго выяўляюць таксама розныя гандляры і прадпрымальнікі, якія займаюцца рэалізацыяй мастацкай прадукцыі, прычым нярэдка разам з рознай іншай, далёкай ад мастацтва ўвогуле і нацыянальнага ў прыватнасці. Рынкавая стыхія ставіць сапраўднае народнае мастацтва ў досыць жорсткія ўмовы, яно далёка не заўсёды можа вытрымліваць канкурэнцыю з нахабным наступленнем базарнага кічу, таннай замежнай масавай прадукцыі. Хоць гэтыя працэсы таксама ў большасці маюць аб’ектыўны характар, але супрацьстаяць яму ў значнай меры ўсё ж магчыма і неабходна. Так, пры арганізацыі масавых мерапрыемстваў варта размяжоўваць майстроў, якія прадаўжаюць і развіваюць традыцыі айчыннай мастацкай творчасці, і розных аматараў рукадзелля ці гандляроў замежнай прадукцыяй, прычым для першых ствараць больш спрыяльныя ўмовы, прадугледжваць розныя прэферэнцыі. Як паказала практыка, гэта прыметна ўздымае статус традыцыйнай мастацкай культуры і яе носьбітаў-майстроў.



Дарэчы тут згадаць негатыўныя вынікі фінансавай палітыкі ў адносінах дамоў і цэнтраў рамёстваў. Даводзімыя ім штогод фінансавыя паказчыкі выканаць за кошт рэалізацыі вырабаў традыцыйнага характару ўдаецца далёка не заўсёды, майстрам даводзіцца пераходзіць на выраб той прадукцыі, якая можа карыстацца попытам на рынку, хоць можа быць досыць далёкай і ад мастацтва, і ад традыцый. Відавочна, што такія вымушаныя ўмовы яўна супярэчаць асноўным задачам дамоў і цэнтраў рамёстваў — адраджэння, зберажэння і развіцця традыцыйнага народнага мастацтва, мясцовых відаў народных рамёстваў і промыслаў. Безумоўна, іх прадукцыя можа і павінна рэалізоўвацца, але яна не павінна залежаць ад стыхіі рынку, уключацца ў агульнадзяржаўны планава-фінансавы механізм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што да іншых бакоў дзейнасці дамоў і цэнтраў рамёстваў, то не ўсё тут адназначна станоўчае, хоць бы па той прычыне, што іх дзейнасць складваецца нярэдка досыць стыхійна, звычайна ў залежнасці ад наяўнасці тых ці іншых спецыялістаў, а то і проста аматараў. У той жа час пры наяўнасці кваліфікаваных, зацікаўленых спецыялістаў стыхійнасць і аматарства з часам могуць набыць належны напрамак нават там, дзе, як лічылася, ужо даўно заняпалі якія-небудзь праявы народных мастацкіх традыцый і дзе як быццам няма на што абаперціся, нерэальна штосьці адраджаць і прадаўжаць. Характэрным прыкладам можа быць дзейнасць Лепельскага, Гарадоцкага, Браслаўскага дамоў рамёстваў, дзе практычна з нуля аднаўляюць традыцыйны касцюм, розныя віды мясцовага ткацтва, вышыўкі, ганчарства і інш.

Разам з тым нельга не заўважыць, што далёка не ва ўсіх дамах і цэнтрах рамёстваў, школах і гуртках народнага мастацтва работа пастаўлена належным чынам. Стыхійнасць і выпадковасць у падборы кадраў кіраўнікоў і метадыстаў прыводзіць да адпаведных вынікаў. Яшчэ не бяда, калі дзеці засвойваюць, скажам, мастацтва батыка, габелена, фларыстыкі, арыгамі, макрамэ і іншых нетрадыцыйных, але па-свойму цікавых відаў мастацкай творчасці, якія падаюцца з адпаведнымі каментарыямі і тлумачэннямі кваліфікаваных спецыялістаў. Куды горш, калі за народнае мастацтва выдаюць розныя вышываныя натуралістычныя «карцінкі» з замежных часопісаў, пераведзеныя ў саламяную аплікацыю творы выяўленчага мастацтва, нізаныя з бісеру дрэвы і іншае рукадзелле, што не мае адносін не тое што да традыцый, а і да мастацтва ўвогуле. У выніку такой дзейнасці выпрацоўваецца і замацоўваецца дрэнны густ, дэвальвуецца само паняцце «традыцыйная мастацкая культура». Таму на гэтым напрамку як нідзе больш патрабуецца цэнтралізаванае кваліфікаванае кіраўніцтва, а таксама няспынная работа па падрыхтоўцы, вучобе, перападрыхтоўцы кіруючых і метадычных кадраў, непасрэдна занятых у гэтым працэсе. Гэтая задача можа быць ускладзена на Інстытут культуры Беларусі, зразумела, пры зацікаўленасці абласных і раённых аддзелаў культуры.



Непасрэдна з такім пытаннем звязана праблема навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па адраджэнню, зберажэнню і папулярызацыі народнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў. Варта адзначыць, што апошнім часам агульнымі намаганнямі даследчыкаў народнага мастацтва падрыхтаваны шэраг самых розных выданняў па гэтай галіне нацыянальнай культуры — як навукова-тэарэтычнага, папулярна-азнаямленчага, так і практычнага, метадычнага характару, што ў знач-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най меры вырашае праблему навукова-метадычнага забеспячэння. Аднак шматлікія і пастаянныя звароты і прэтэнзіі майстроў і спецыялістаў сведчаць, што падобных выданняў і недастаткова, і асвятленне атрымалі яшчэ далёка не ўсе віды рамёстваў. Так што поле дзейнасці даследчыкамі і спецыялістамі ўзаранае яшчэ не ўсё.

Вядома, што попыт нараджае прапанову. Не дзіва, што рынак друкаваных выданняў запоўнены самай рознай прадукцыяй, пераважна замежнага паходжання, якая, у лепшым выпадку, не мае адносін да нацыянальных традыцый, у горшым — увогуле прапагандуе безгустоўнасць і антымастацтва. Між тым у народзе яшчэ ёсць давер да друкаваных выданняў, і калі ў рукі майстрыхі-вышывальшчыцы трапляе распрацоўка пад спекулятыўнай назвай «Современная художественная вышивка», яна адкладвае ўбок традыцыйнае, але, аказваецца, «несовременное» шытво і старанна капіруе пераведзеныя ў крыжык творы выяўленчага мастацтва, галандскія пейзажы і інш. Моладзь жа і ўвогуле можа пачаць знаёмства з народнай культурай якраз па такіх выданнях. Прычым такая друкаваная прадукцыя нярэдка некрытычна і некваліфікавана ўспрымаецца не толькі майстрамі, але і работнікамі культуры, кіраўнікамі і арганізатарамі, што ў выніку толькі памнажае негатыў. Як засведчыла практыка стасункаў з народнымі майстрамі, выпраўляць вынікі бывае досыць складана: далёка не ўсе майстры разумеюць і адэкватна ўспрымаюць крытычныя заўвагі, і асноўным аргументам у такіх выпадках з'яўляецца наяўнасць аўтарытэтных для іх шматлікіх і разнастайных друкаваных выданняў. Супрацьпаставіць гэтаму можна хіба айчынныя выданні і дапаможнікі, якія, на жаль, па розных прычынах можна бачыць далёка не ва ўсіх дамах рамёстваў і іншых установах культуры, якія непасрэдна займаюцца праблемамі адраджэння і развіцця традыцыйнага народнага мастацтва. Відавочна, што мець хоць бы невялікую бібліятэчку навукова-метадычных выданняў і дапаможнікаў па розных відах традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі павінен кожны дом ці цэнтр рамёстваў, кожная раённая ўстанова культуры.

Не лішне яшчэ раз нагадаць пра даўно набалелую праблему — адсутнасць прадстаўнічага музея народнага мастацтва. Яшчэ Дзяржаўная праграма падтрымкі традыцыйнай культуры, прынятая ў пачатку 90-х гг., заяўляла пра адкрыццё Нацыянальнага музея народнага мастацтва ў 2005 г., але ніякіх зрухаў на гэтай ніве не відаць і сёння. Між тым такі музей патрэбны не толькі як важная метадычная база для майстроў і спецыялістаў у галіне народнага мастацтва, як каштоўнейшы збор набыткаў традыцыйнай культуры і лепшых твораў сённяшніх народных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстроў. Не іначай як парадоксам можна лічыць тое, што наш нацыянальны гонар — найбагацейшую народную культуру — мы не можам прадэманстраваць замежным гасцям, якія праяўляюць да нашай культуры заканамерную цікавасць, але задаволіць яе не могуць.

Усялякай ухвалы заслугоўвае ініцыятыва мясцовых улад, у выніку чаго з'яўляюцца музеі па розных відах культуры пэўнага рэгіёна, як, напрыклад, музей традыцыйнага ткацтва ў Полацку, музей народнага мастацтва ў Моталі Іванаўскага раёна ці «Бездзежскі фартушок» у Драгічынскім раёне. Відавочна, што падобныя музеі агульнай ці тэматычнай скіраванасці пажадана арганізаваць у кожным раёне ці хоць бы адметным рэгіёне. У той жа час добрая ідэя адкрыцця музеяў-майстэрань творчасці асобных майстроў пакуль што, наколькі вядома, яшчэ нідзе не знайшла ўвасаблення. Можна назваць хіба толькі экспазіцыю «Успаміны Бацькаўшчыны» на сядзібе майстра-разьбяра М. Тарасюка ў в. Стойлы Пружанскага раёна, але з'явілася яна толькі дзякуючы намаганням самога майстра, і будучыня яе пакуль досыць няпэўная. Між тым час уносіць свае бязлітасныя карэктывы, і сёння нават пры самых лепшых намерах нерэальна адкрыць дамы-музеі на сядзібах такіх вядомых майстроў-разьбяроў, як А. Пупко (Івянец Валожынскага р-на) ці П. Зяляўскі (Слабодка Браслаўскага р-на). Праўда, апошнім часам разгарнулася актыўная дзейнасць па наданню асяродкам традыцыйных рамёстваў і асобным народным майстрам статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, але мала абмяжоўвацца адным толькі наданнем статусу, патрабуюцца рэальныя меры па падтрымцы такіх асяродкаў і майстроў.



Досыць перспектыўнай сферай развіцця розных відаў народнага мастацтва і традыцыйных рамёстваў можа стаць турызм. Сёння ў краіне ўжо больш за тысячу агра- і этнасядзіб, але далёка не ўсе з іх выяўляюць рэальную зацікаўленасць у мясцовых народных майстрах і іх творчасці. Між тым узаемная выгада тут відавочная: уладальнікі сядзібы ствараюць ёй адметны імідж, мясцовы народны майстар атрымлівае пастаянны занятак і заробак.

Зразумела, што сказанае далёка не поўнасцю ахоплівае ўсё кола праблем, якія адзначаюцца ў сучаснай народнай мастацкай культуры ў цэлым і мастацкіх рамёствах у прыватнасці. Тым не менш досыць выразна вызначаецца, бадай, галоўнае: зберажэнне, адраджэнне і развіццё важнейшай галіны нацыянальнай культуры павінна быць перш за ўсё прыярытэтным кірункам дзяржаўнай культурнай палітыкі. Менавіта народная мастацкая культура вызначае адметнасць нацыі ў супольнасці іншых народаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галіна Суша

член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, супрацоўнік аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці Інстытута культуры Беларусі (г. Мінск, Беларусь)

# Рэгіянальныя традыцыі Лепельшчыны: сучасны стан, захаванне і адраджэнне народных строяў

Традыцыйны касцюм з'яўляецца адным з найважнейшых кампанентаў, якія вызначаюць культурную прастору Беларусі. У ім увасобіліся эстэтычныя ўяўленні, этычныя погляды, вераванні беларускага народа. Касцюм — гэта адна з самых устойлівых з'яў традыцыйнай культуры, якая служыць неабходным атрыбутам пры вывучэнні этнічнай гісторыі народа, яго абрадаў і звычаяў. Як сінкрэтычны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва касцюм дае ўяўленне аб шматлікіх традыцыйных рамёствах беларусаў: ткацтве, пляценні, ювелірным мастацтве, апрацоўцы скуры і інш.



З'яўляючыся этнавызначальнай прыметай для ўсёй Беларусі, касцюм у розных рэгіёнах краіны мае вызначаныя асаблівасці, якія ствараюць непаўторныя каларыты. Гэта архаічнасць і чысціня ліній на Заходнім Палессі, маляўнічасць на Усходнім Палессі, гарманічная ўраўнаважанасць у Цэнтральнай Беларусі, манументальнасць у Падзвінні, дынамічны сілуэт у Панямонні, незвычайная разнастайнасць і багацце дэкору ў Падняпроўі.

Буйныя гісторыка-этнаграфічныя вобласці Беларусі ў сваю чаргу маюць зоны лакальных асаблівасцей традыцыйнага касцюма ў тэхніцы выканання, у спосабе нашэння дэталей вопраткі, у характары арнаменту і інш. Такія лакальныя разнавіднасці касцюма вызначаюцца тэрмінам «строй». У Беларусі налічваецца больш за 30 строяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ